**УДК 39**

# КУРГАНЫ Ў МІФАПАЭТЫЧНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

***Д. А. МАЛЧАНАВА***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Курганы займаюць асобнае месца. Семантычная нагрузка курганаў у міфапаэтычнай карціне свету беларусаў Падзвіння вынікае з іх падкрэсленай вылучанасці як з свету прыроды, так і з прасторы культуры. Курган фактычна заўседы суадносяць з ідеяй не "свайго", а " іншага", "чужога" як у міфалагічным, этнакультурным, сацыяльным, так і ў часавым плане. І курганы разглядываюцца ў кантэксце як нешта "даўняе" і не ўпісваецца ў калектыўную гісторыю вясковай грамады.*

***Ключавыя словы:*** *курганы, валатоўкі, капцы, скарбы, зданькі.*

Археалагічныя помнікі займаюць вельмі спецыфічнае месца ў традыцыйнай карціне свету. Найперш ідзе размова пра курганы, гарадзішчы і замчышчы. На тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў пазаставалася даволі шмат курганоў. Як падлічылі археолагі, што ў нашай краіне налічваецца больш за 2400 курганных могільнікаў. Курганныя могільнікі датуюцца ў асноўным канцом I – пачаткам II тысячагоддзя. Сустракаюцца курганы эпохі бронзы, ранняга жалезнага веку і часоў позняга сярэднявечча.

У народнай міфалогіі прасторы, дзе кожны элемент навакольнага свету, апрача свайго асноўнага значэння, мае дадатковы сімвалічны статус, курганы і гарадзішчы займаюць асобнае месца. Гэта вынікае з іх падкрэсленай вылучанасці як з свету прыроды (роўная пляцоўка і валы гарадзішча, паўсферычны курганны насып не маюць прыродных аналогій), так і з прасторы культуры ( створана, культываванай чалавекам). У апошнім выпадку мяжа паміж археалагічнымі помнікамі і "сваім" светам для вяскоўца праходзіць па часавай шкале (што невыключае і прасторавага адмежавання, бо вельмі часта курганы і гарадзішчы размяшчаюцца ў прыроднай зоне, якая не належала чалавеку). Гэта азначае, што і "валатоўкі" і "гарадкі", нягледзячы на штучны (не-прыродны) характар іх паходжання, не ўпісваюцца ў актуальную калектыўную гісторыю вясковай грамады, а разглядаюцца толькі ў кантэксце "даўняй" (міфалагічнай, эпічнай) гісторыі, калі жылі і дзейнічалі "іншыя" людзі, памяць пра якіх захавалася на роўні міфалагічных архетыпаў, а не персаналій [3. с, 436].

Курганы ў народных уяўленнях амаль заўседы суадносяцца з ідэяй "чужога" , якая ў кожным асобна ўзятым выпадку можна мець сваё канкрэтнае напаўненне: апахальна-міфалагічнае ( волат, асілак– першыя насельнікі краю, суаднесеныя з міфалагічнай эпохай першастварэння, якая супрацьпастаўлена "свайму" часу; змей-кравец-персанаж чыста міфалагічны, агент іншасвету сярод людзей); этнакультурнае (французы, шведы, татары–выразныя "чужынцы" ў народнай карціне свету); сацыякультурнае ( найменні кшталту "Батурава гара", "Магіла Рагнеды" ці "Княжая магіла" выводзяць на фальклярызаваныя вобразы валадароў, носьбітаў вышэйшай, сакралізаванай у вачох вясковый супольнасці, улады; у гэтыя рамкі зпісваецца і сюжэт з канфліктам паміж дзвюма варожнымі вясельнамі партыямі) [3. с, 438].

Існуе шмат паданняў, звязанных з войнамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі. Паданні пра французкія, татарскія, літоўскія, швецкія курганы адлюстроўваюць ваенную гісторыю. У народных паданнях, для насельніцтва Паўночнай і Цэнтральная Беларусі, дзе вайна 1812 года пакінула жорсткі след, аб'ектам фальклярызацыі стала войска Напалеона. Трэба азначыць, што ў большасці выпадкаў "французскія магілы" з'яўляюцца масавым месцам пахавання салдатаў напалеонаўскай арміі.*"А гэта, наверна, мучэньне было для салдат, як яны капалі эты, ну этыя магілы. Мы во раз ішлі, там тады бугаркі такія былі, цяпер ужо заросшыя, я ўжо цяпер тожа не знаю. А я там пасьціла з бабкай, што во тут во жыла. Я з ёй пасьціла кароў, ну вот, як Навіньне праедеш, і вот дарога гэта пачынаецца. Ну тут вот, як адсюда налева, бугаркі вот такія вот. І я гавару: "А што гэта за бугаркі?" А яна гаварыт: "Вот тут французы пахаронены". Я гавару: "А чаго тут?" – "Ну, вот кагда-та вайна была, і вот тут пахавалі". І праўда вот – нескалька бугаркоў. Гаварыт: "Тут французы", "Ёсць Француская гара, на гэтай гарэ пахаронена много французаў у вайну 1812-га года. Далей, па правую старану жалезнай дарогі, у Боркавічах. Людзі ходзяць, успамінаюць тых пакойнікаў*" [4.с, 267-268, 269].

Таксама ў паданнях расказваюцца пра курганы, якія засталіся ад вайны з шведамі. Напрыклад, курган, каля вёскі Верацяі гэта магілы шведаў, якія былі пахаванныя разам з сваімі маёмасцямі. У вёсках Шклянцах і Нябышына Докшыцкана раёна і сёння яшчэ расказваюць, што курганы засталіся ад вайны з туркамі. У Шклянцы нібыта быў некалі вялікі бой і пагібнула шмат вояў. На пахаванне раптам прывезлі грошы, падрыхтаваныя для аплаты іх вайсковых паслуг. Было вырашана залатыя манеты пакласці разам

з ваярамі ў магілу. Курганы каля вёскі Верацеі на поўначным заходзе Віцебшчыны - гэта нібыта магілы шведаў, якія разам з забітымі шмат схавалі маёмасці [2, с. 219].

Надзвычай вялікая частотнасць “ваеннай тэматыкі” ў тапанімічных паданнях абумоўлена спецыфікай беларускай гісторыі, калі краіна вельмі часта станавілася на шляху розных захопнікаў. Але, з другога боку, немалаважная і сімвалічная інтэрпрэтацыя вайны ў міфапаэтычнай карціне свету. Адсюль, як ні парадаксальна, вайна, нягледзячы на свой дэструкцыйны характар, як і любая падзея экстраардынаргана, переломнага (пераходнага) характару, выяўляе свае стваральныя патэнцыі. Пасля вайны традыцыйна культурны ландшафт папаўняецца новымі элементамі. І не толькі пахаваннямі, што само па сабе лагічна, але і паселішчамі і нават культавымі месцамі [3.с, 450].

Для міфалагічнай інтэрпрэтацыі курганных пахаванняў у народнай свядомасці вялікую ролю адыгрывалі іх незвычайныя памеры, што пры параўнанні з памерамі “нармальных” магіл, у якіх пахаваныя сваякі і аднавяскоўцы, фармавала ўстойлівае ўяуленне пра надзвычайныя фізічныя ўласцівасці людзей, якія знайшлі свой спачын у курганах. Не ў малой ступені гэта карэлюецца і з міфалагічнага ўяўленнямі пра веліканаў-волатаў (асілкаў), якія жылі ў часы першастварэння [3.с, 439].

Назва Валатоўкі характэрна ў асноўным для басейна Заходняй Дзвіны. Вобраз, вялікіх людзей суадносіцца з курганамі, якія маюць гэтую назву і гэта значыць там былі пахаваныя волаты. Ёсць выпадкі, калі адзін і той жа курганный могільнік называюць і Валатоўкі і Капцы. У некаторых мясцовасцях Віцебшчыны Валатоўкамі называюсь нават сучасныя могілкі. *“А вот у нас тут кар’ер ёсьць і кладбішча даўнее-прыдаўнее. І дзе яны, не знаю, пры Польшчы адкапвалі. Дзе бальная гара, мой тата адкапваў і казаў: “Там бальшыя людзі - па два метры, і чарап і зубы - усе большае за нашае”* [3. с, 272]. Разам с тым, вялікі курган суадносяць з персанажамі фальклорнай гісторыі, а ў народнай свядомасці памеры курганоў адпавядаюць іх статусу. Інакш кажучы, вялікаму чалавеку, князю, княгіне і так далей. Ёсць паданне пра курган на тэрыторыі Лепельшчыне, пра князя і княгіню. Народнае паданне кажа; што калісьці, вельмі даўно, жыў паблізу гэтага месца нейкі князь. У яго была прыгожая маладая жонка. Аднойчы князь выехаў на вайну, і калі вярнуўся з паходу, то знайшоў сваю жонку за іншым князем. У парыве рэўнасці і гневу, шчаслівы на вайне, але няшчасны ў каханні, князь забіў сваю няслушную жонку, а потым і сябе. Іх пахавалі побач, але ў двух асобных курганах. І сапраўды: іншы курган, у адлегласці на дзве сажні ад першага, заключаў жаночы шкілет, у якога на правай руцэ быў род бранзалета з тоўстай бронзавага дроту, з нанізанымі каралямі з нейкай масы, велічынёю з ружэйную кулю [5. с, 24].

У фальклорнай гісторыі штодённасці курган як локус супрацьпастаўлены “сваёй”, культурнай, засвоенай прасторы (паказальнай ёсць адсутнасці надмагільных крыжоў насыпах), маркіруе зону маргінальную, да якой у сацыякультурным плане прыналежыць людзі, што вылучаюцца ў калектыве сваімі “анты-паводзінамі”. “Калі нутраны свет узнаўляе космас, то з таго боку яго мяжы размяшчаецца хаос. Антысвет, пазаструктурная іканічная прастора, населеная пачварамі, інфернальнымі сіламі ці людзьмі, якія з імі звязаныя. За рысай паселішча павінны жыць у вёсцы – чараўнік, млынар і (часам) каваль…” Невыпадкова адсюль і тапаграфія размяшчэння каваля (а таксама млына і чараўніка ў адной асобе) у беларускай вёсцы: “ А там далей, дзе той курган, была кузня, бо яшчэ й цяпер там ёсць перапаленае каменне, гліна й вугалле. Гаспадаром таго млына й кузні быў Рымар. Ён не толькі малоў збожжа ў млыне й выробляў у кузні розныя зялезныя рэчы, але яшчэ ён умеў выражаць і чараваць. Ён мог чалавека перавярнуць у ваўка ці іншага звера або чалавека перавярнуць у камень” [3.с, 441].

Таксама трэба адзначыць паданні пра курганы, у якіх схаваныя скарбы, у час якой-небудь вайны. У фальклорнай інтэрпрэтацыіі золота можыць належыць розным этнічным групам, а менавіта “французам”, “шведам”, “татарам” усе залежыць ад лакальных варыянтаў гісторыі.У якасці скарба можа выступать і бочка з золатам, зброя, куфар, залатая карэта. Для Падзвіння характэрны паданні пра “золата Напалеона”, якое французкія салдаты закапалі ў час вайны 1812 года. “Ай, гэта французскія магілы, сто раз іх правяралі. Во тут, за Буём. Ну як нейкія ж французы тут былі, пабітыя. Французскія. Гэта расказвалі як жа вот. Тут нейскія ж куча гэтага, ссуваная каменю, капаліся там, казалі, там французскае золата пахаванае, не нашлі там нічога” [4. с, 267]. Такім чынам, у народнай свядомасці вайна не толькі выступае з ідэямі разбурэння, голаду, смерці, але таксама і з скарбам і грашыма. Невыпадкова, што на тэррыторыі Падзвіння, шмат паданняў пра незлічоныя скарбы Напалеона.

Акрамя нязлічоных скарбаў, на курганах, з’яўляюцца зданькі. Яна найчасцей з’яўляюцца ў начны час. Зданкі могуць выступать ў выглядзе жывёл, людзей, агеньчыкаў, у розных сакральных месцах. Зданкі зазвычай уяўляюцца ў выглядзе жанчыны ў белым адзенні, якая плача ці са свечкай ў руках. “Дык вось як было. Ніхто не паняў і ніхто гэтага не зразумеў. […] Ну, там зданкі пастаянна ўсе гэтак здаваліся, дзе гэтыя магілы бальшыя былі. І едуць назад, і пайшлі ха гэтым, за чыстацелам. Дзімка на дарозе стаіць каля машыны, і яны ідуць, а ён іх фатаграфуець. І вот сфатаграфаваў і на чуда: яны йдуць, а памярод чалавек, ну не чалавек, только трошку каленкі прыгнеўныя і такі скорчыўся, галава крыху такая ссутеленая. Алі белы, толькі з фігуры чалавек. І у фатаапараце гэта было, на плёнцы. Гэта было на

валатоўках, дзе курганы, што пахароненыя ляжаць" [ 4.с, 115]. Па гэтаму паданню становіцца зразумела, што курган, як месца ў міфалагічным плане небяспечнае.

Такім чынам, фальклорныя сюжеты звязанныя з курганамі суадносяцца выразна з крызіснымі момантамі, найсцей з войнамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, пакалькі наша краіна нярэдка становіцца на шляху розных захопнікаў. На тэрыторыі Падзвіння ўзначнай колькасці паданняў фіруе менавіта Напалеон і яго армія. І ў паданнях Напалеон выступаеае як "чужынец" і мае адмоўны ці нейтральны статус. Паданні пра скарбы, схаванныя у час даўняй вайны, таксама прадстаўляюць сферу "чужога" , бо ухавальнікамі скарба з'яўляюцца "чужынцы" ( французы, шведы, тататы і так далей). Таксама трэба разгледзіць той факт, што курганы можа выступаюць як месца небяспечнае, бо звязанна яно так і з інфернальнымі сіламі.

ЛІТАРАТУРА

1. Дучыц Л. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў/ / АН Беларусі, Ін-т гісторыі; пад рэд. М. А. Ткачова. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1993. – 59 с.
2. Дучыц Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Л.Дучыц, І.Клімковіч. – Мінск: Літаратура і Мастацтва. – 2011. –349 с.
3. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік/ уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.– Вып. 2. Ч.1: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. Ч. 1.–Наваполацк : ПДУ. – 2011. –290 с.
5. Сементовский 1890 – Сементовский, А. К. Белорусские древности / А. К. Сементовский. – СПб.: Типо-лит. Н.Степанова, 1890. – 137 с.